# ГОРАД N

Вершы

I

## ЛІЛЕЯ

Жыве ў душы надзея,
Што ўсё — наадварот,
І недзе ёсць лілея
Між чыстых сініх вод.

Не там, дзе йльсніцца багна,
Чуваць атрутны пах,
І цемра гідка, прагна
Паўзе па чаратах.

Не між балот маўклівых,
Дзе смокча ціну твань,—
Плыве-квітнее дзіва
Сярод празрыстых хваль.

Лілею звер шукае,
Над ёю птах кружляе.
Пакуль лілеі плыць —
Датуль мне ў свеце жыць.

ВАРАЖБА

Ноч. Вядзьмарка жне палын
У прагорклым полі,
На далёкі чорны млын
Носіць у прыполе.

Неба зоркамі мігціць,
З шыбеніцы д’ябла
Мёртвы месячык вісіць,
Недаспелы яблык.

Ходзяць жорны хадуном,
Аж рыпіць каменне.
Пахне горкім палыном
Ведзьміна ўтрапенне.

Зварыць келішак пітва,
Развядзе крывёю:
Праясніцца брыдкі твар
Чыстаю слязою.

## ЦЕЛА

Звялося высахлае цела,
Стамілася акрас жыцця:
Адно жадлівасць ацалела
І боязь змроку небыцця.

Шчэ прагне пекнасці дзявочай,
Жаночых пешчаў не стае,
Адзіным разам плоці хоча
І бессмяротнасці тае.

Рагоча нехта злы, адвечны
З яго брыдкіх, сляпых патуг.
Але прачнецца недарэчны
Ў зламаным целе моцны дух.

Яму скляпенне цела — краты,
Скамечаная плоць — турма,
Ён бурапеніць, як пракляты,
І прападае задарма.

ДУША

Пад смех абгортачнай паперы,
Даверлівы, прадам душу,
У кожнадзённы тлум, хімеры,
Яе, балесную, скрышу.

Яна, празрыстая, рыдае,
Запляміў ясны колер бруд.
Яе карона залатая
Злятае на пярэсты брук.

Карона боскасці няпэўнай,
Няздзейсненага пачуцця;
І будзе іншага царэўна
Кахаць да самазабыцця.

А я, знясілены, без веры,
Зямнога шчасця папрашу:
Пад смех абгортачнай паперы
Мне кінуць наўздагон душу...

ГАРА

Каменны твар гары
Ірваў калючы вецер.
Ўзмацняўся ціск на сэрца
З глыбінь зямной кары.

З прыроднага разрэза
Самотны крэкт гучаў.
Кавалася душа
З патрэбнага жалеза.

Алмазнага разца
Ўпіліся ў цела іклы,
У домнах руды зніклі,
І холад сэрцта сцяў.

Стаіць, глядзіць гара,
Крышталь-сляза на вейках.
А дзесь яе душа
Імчыць-пыхціць па рэйках.

ГЛЕЙ

Пад тоўшчай вод гарачых
Жыццё люляе глей,
Тугу парожніх дзей
Імкнецца перайначыць.

Яшчэ ён не жывы,
Але даўно не мёртвы.
Ён прагне дум істотных
І пошуму травы.

Палае сонца шар,
Праносяцца каметы,
Хавае твар планеты
Бязмежных вод абшар.

Зялёны слізкі глей
Варушыцца, цвярдзее.
І кволіцца надзея —
Пачатак ўсіх надзей.

ВОЎК

Шэры воўк, калматы воўк,
Таямнічае стварэнне,
За людскія прыграшэнні
Сплачваеш крывавы доўг.

Чалавек любое зло
Лічыць за тваю ўласцівасць:
Жорсткі, ненажэрны, хцівы,
Сквапны больш за ўсіх звяроў.

Ледзь не д'яблава рука...
О, хоць хто б калі прызнаўся:
Сам сябе каб не баяўся,
Кожны з нас цкуе ваўка!

І таму заўжды знарок
Чалавек ваўка страляе,
А разгублена трапляе
У чарговы свой парок.

МЯЖА

Ён — рыбіна, ты — птушка,
Альбо — наадварот.
Адзін — пад тоўшчай вод,
Другую вецер гушкаў.

Смяротна вам кахаць,
Вы — розныя стыхіі,
Падобныя такія,
Вам шчасця не зазнаць.

З крутога віража
Імкнецца да паверхні,
Ён — знізу, а ты — зверху…
Смяротная мяжа!

Але, вады глынуў,
Хаця адно спазнаеш:
Ён — тоіць глыбіню,
Ты — вышыню хаваеш.

ЦВІК

Стары, іржавы цвік
Трымае рэшткі даху
Пакінутага гмаху,
Дзе толькі змрок і цвіль.

Балюе хіжы вецер
Сярод пустой будовы,
Рыпіць зламаны ровар,
Прыкрыты брудным веццем.

Тырчыць гнілое сена
Правальваецца столь,
Аселі ў мяккі дол
Разбураныя сцены.

Бы прадсмяротны крык
Злятае водцень жаху.
І толькі ўпарты цвік
Трымае рэшткі даху.

ПРАКЛЁН

Праз сцены бачыць... Жах які!
Пакутай гэткае уменне.
Сустрэнуць з болем сябрукі
Вачэй тваіх звышпранікненне.

Пазбавіш іх усіх правоў,
Усіх дзівацтваў і сакрэтаў,
Узняўшы цяжар іх грахоў,
Сябе ж і праклянеш за гэта.

Знутры, знадворку — для цябе
Вялікай розніцы не будзе.
І ўсё ж у боскай барацьбе
Нарэшце перамогуць людзі.

Яны ўзвядудь са шкла палац.
Ты смела зойдзеш, і з парога
З палёгкаю на гэты раз
Не ўбачыш анічога.

## ГОРАД N

Ранак. Вулачка непрыгожая.
Прачынаецца вінны склеп.
З тратуара дзяўчынка прахожая
Пазірае на шыльду «Chleb».

Чалавек брыдзе, не спяшаецца,
Бы вяртаецца з ночы ў дзень.
Каля склепа раптоўна спыняецца.
Нешта ўспомніў, назад ідзе.

Смецяры сваю працу скончылі,
Разыходзяцца па шынках.
Пад зямлёю чуваць, як ракоча і
Захлынаецца ў злосці рака.

Горад, горад! Чаму так тужліва?
Гоніш роспач — прыходзіць сум.
Разгубіўся ў натоўпе імклівым
Адзінокі і смешны лясун.

МЕТРО

Зямля лянiва адчыняе
Сваё таемнае нутро:
Шторанак працу пачынае,
Гудзе падземнае метро.

Плыве, сцякае эскалатар
Ракой бясконцай, цвёрдай, плыннай.
Вагонны голас хрыплаваты
Чарговы вызначцыць прыпынак.

Успыхне станцыя святлом
I зноўку запануе цемра.
Ляцiць былы металалом
У чорнае танэля зеўра.

Сiвы дзядулька  з-пад iлба
Глядзiць дарэмна ў люстра вокан:
Чугунных рэек варажба
I электрычны цiск навокал.

ПРАЦА

Струменіць кветка млосны пах,
Ад вільгаці ратуе дах,
Шкло выпраменьвае празрыстасць,
Плакаты дораць урачыстасць.

Ліхтар перамагае змрок,
Зіхціць крыламі матылёк,
Таемна рыбіна маўчыць,
Пранізліва пугач крычыць.

Упэўнівае знак дарожны,
Засцерагае сон трывожны.
На фабрыцы працуе вецер
І сонца недарэмна свеціць.

Хто можа вызначыць праўдзіва:
Дзе ў свеце праца, дзе — ўласцівасць?
На дол лістоту клён скідае,
Яе смяцяр у груд змятае.

КАЗЮРКА

Сутоніцца маўклівы горад,
Шарэюць дрэвы за акном.
Душа твая — металалом,
Набытак успамінаў хворых.

Душа твая — металалом
Мінулых рэчаў і здарэнняў:
Стары тралейбусны талон,
Цукерак і манетак жменя,

Дарэмны сёння тэлефон
На скрэмзаным шматку паперы
І знак дарожны на фанеры:
Ляціць машына пад адхон.

Смяецца любая дзяўчына –
Табе з ёй добра гэтым часам...
Раптоўна ўспыхне прад вачыма
Казюркі пляма пад абцасам.

ПТАХ

Чорны птах заляцеў
У замглёны пакой
І ўсю ноч шарахцеў
Нада мной, над табой.

Можа выйсця шукаў
З невядомага гора;
Мо, сяброўку гукаў
У неонавы горад?

Грукат колаў трамвайных —
За акном сярод ночы.
Крык птушыны адчайны —
У сцюдзёныя вочы.

Узмахнуў птах крылом
І прыціх у журбе.
Выйсця і не было
Ні ў мяне, ні ў цябе.

КАТОК

Мурзаты кот злавіў шпака
Каля зараслага стаўка.
А потым прагна, гідка еў,
Зламаным крыльцам храбусцеў.

Вадой запіўшы свой сняданак,
Лянiва слізгануў на ганак;
Нахабна адчыніўшы сенцы,
Прыпёрся ў залу, на акенца.

І тут, прылашчаны дзяўчынкай,
З ёй блазнаваў, вурчэў катрынкай,
Дазволіў казытаць за вушкам,
Ганяўся за ірдзістай стужкай.

На цёплых коленцах дзяўчыны
Нарэшце ўладкаваўся чынна.
А на двары самотна, горка
Блішчэла кінутае пёрка.

# II

ЧЫРВОНЫ АЛОВАК

Я пісаў пра снягі і завеі,
пра дзівосныя малюнкі на шыбах,
пра рэчку, скаваную ільдом,
і пра іншыя прыкметы зімы.
Але ўсё гэта безнадзейна растала
і загінула,
бо я пісаў
чырвопым алоўкам,
а гэты колер такі гарачы...

## ПЛЮШЧ

Шмат ворагаў лезла на муры.
Жывыя, яны падалі мёртвымі.
Аднаму табе даравалася.
Пажаўцелі косці абаронцаў і захопнікаў,
пастарэў нават змрочны камень.
Ты — малады і жаўцееш толькі ўвосень.
Зялёны плюшч захапіў увесь замак...

## НЕПАЧАТЫ ВЕРШ

...а дню таксама цяжка быць.
Куды лягчэй жывецца
вечару ці ночы,
ужо не кажучы пра ранак.
Бо ранак –
прадчуванне дня,
як вечар –
смутак па яго зыходу,
як ноч –
салодкі сон пра дзень.
І толькі дзень,
ён — дзень, і толькі.

Так лёгка нам жыццё
і прадчуваць,
і смуткаваць па ім,
і сніць.
Складана — жыць.

## ВЯСЁЛКА

Быў дзікуном і драпежнікам,
але вынайшоў лук,
гледзячы на сем колераў вясёлкі
(як ні дзіўна, вясёлка была
і ў першабытныя часы).
Зусім верагодна, што і яго забілі
з лука, але ён так і не зразумеў,
чаму ад вясёлкі застаўся
толькі чырвоны колер.

## ЗГРАЯ

Каму здаралася цёмнай зімовай ноччу
сустрэцца сам-насам з воўчай зграяй
і пабачыць у жудасна-засяроджаных вачах
драпежнікаў
той халодны, бязлітасны бляск,
які не затухае ні на імгненне
вось ужо каторае тысячагоддзе?
О, вам пашанцавала:
у вас ёсць магчымасць і верагоднасць
зразумець самотную і велічную
душу ваўка,
калі ў вас ёсць такое жаданне.
Але сцеражыцеся,
бо ў ваўкоў яшчэ больш
жадання і верагоднасці
дабрацца да вашага сэрца.

## У АБАРОНУ ЧАЛАВЕКА

Мурашынае грамадства
разглядала пытанне
шкоднасці людзей
і свае магчымасці
ў барацьбе з імі.
Вырашылі:
чалавек – першавіноўнік
сусветнага хаосу.

Ляснік у гэты час
агароджваў мурашнік.

## ЧАЛАВЕК-ГОРАД

Чалавеку прымроілася,
што ён — горад:
узіраецца вачыма светафораў,
размаўляе дарожнымі знакамі,
дыхае лёгкімі паркаў і вентылятараў.
Але паступова ў яго сэрца
прасачыўся жах скрозь вены каналізацыі
і міязмы змяшаліся з крывёй,
ад чаго горад-чалавек
памёр і прачнуўся.
...Гораду ў гэтую ж ноч
здалося на імгненне,
што ён — чалавек.
Але толькі на імгненне,
бо горад падумаў:
«Глупства. Калі б я ім быў —
хіба жыў бы ў горадзе?!»

## РЫБІНА

Мёртвай, парожняй ноччу
пасля тэлефоннай адзіноты
зноў не вытрымаюць
збуцвелыя шлюзы рэальнасці.
Чорныя, атрутныя патокі
галюцынацый
рынуцца ў рэчышча свядомасці,
а тлустая рыбіна ісціны,
выкінутая на глеісты бераг,
зноў будзе маўчаць
і паслухмяна зіхацець срэбрам
пад уяўным месячыкам.

## ДЗВЕРЫ

Рыпнуць дзверы,
цішыню парушаючы,
і мінулае верне адбітак яшчэ ранейшага.
Што там,
за прачыненымі дзвярыма невядомасці?
Але дзень пачынаецца,
і ўсё робіцца відавочным...

## ВАРТАЎНІК

Мокры вецер скуголіў
усю ноч каля пад’езда.
Я зразумеў:
той самы вецер,
хлопчык-вецер,
што тыдзень назад
абагнуў услед за мной
вугал дома
і ўварваўся ў стары,
амаль гатычны дворык.
Тыдзень назад
знік у горадзе шэпат лісця
і шоргат абгортачнай паперы.
флюгер знайшоў нарэшце
патрэбны кірунак.

Хлопчык-вецер,
палонны вецер,
недарэчны вартаўнік
падазронага нашага шчасця.

## ШЧАСЦЕ

Аднойчы пад маімі вокнамі
крычалі, звар'яцеўшы, людзі,
што ў горад наш прывезлі шчасце –
яго ў кіёсках прадаюць.
І я, падхоплены натоўпам,
памчаўся, як і ўсе, па шчасце.
Ды толькі, незнарок, спазніўся,
бо дэфіцытны быў тавар.
А ты вярталася шчаслівая,
і для цябе было замнога.
Ты падзялілася са мною,
і разам мы далей пайшлі.
І вось жывём з табой у шчасці,
спакой якога так абрыд нам,
што, як і іншыя, чакаем,
калі нам гора завязуць...

## АБДЫМКІ

Твае абдымкі былі слабымі,
не трымалі,
калі ішоў да іншай.
Нават у пяшчоце не былі
гарачымі.
Пакрыўджаныя, не развітваліся.
Чаму ж, калі падаў у бездань,
ратавалі нязменна,
рабіліся моцнымі?

АХВЯРА

Аддаю цябе кветкам:
неабходна сплаціць
за мільёны загінуўшых красак
у руках у жанчын.
Ты — адплата за ўсіх іх,
зноў народзішся — кветкай.
Сярод тысяч падобных сабой
незабудак
адшукаю цябе, не забуду:
цеплыню сярод сонечных пырскаў,
жанчыну сярод прыгажосці.
Гэта цяжкае выпрабаванне...

Ты сказала, што кветкі — анёлы,
а пялёсткі — іх крылы.

АДРОЗНЕННЕ

Спытаў:
«Чым адрозніваюцца людзі,
звычайныя і жывыя,
ад паэтаў?»
Адказала сур’ёзна:
«Сярод першых — мільёны кахаюць,
а гаворaць і пішуць пра гэта
адзінкі.
У паэтаў
усё ў адваротным парадку.

ФІЛОСАФ І САБАКА

Філосаф вывучаў людзей
і меў сябрам сабаку.
Заўсёды яны адзін аднаго
разумелі,
гэтыя пакаёвыя істоты.
Сабака палохаўся толькі,
калі мудрэц крычаў на яго:
«Гэй ты, чалавеча!»
То было найвялікшай абразай,
за якой – пакаранне...

КОСТКА

Я прыходзіў учора,
я прыходжу сёння,
я прыйду заўтра,
а цябе — няма.

Я чакала ўчора,
я чакаю сёння,
я буду чакаць заўтра,
А ты — не прыходзіш.

Які жах!
Прыйшоў — і не ўбачыў.
Якое гора!
Ірайшоў побач — і не здагадаўся...

Трэці дзень ляжала
пад кустом бэзу костка.
Трэці дзень галодны сабака
шукаў ежу.

Лілася над зямлёй
песня сустрэчы...

СМЯЦЯР І СМЕТНІК

«Няўжо гэта – таксама жыццё?» –
змрочна падумаў смяцяр,
зірнуўшы на сметнік.
«Так,— маўкліва сметнік пацвердзіў, —
бо ёсць кветкі сённяшнія
і кветкі ўчарашнія».

ПАЭТ

Аддалі яму ва ўладу
радасць безупынную і весялосць.
І намалявалі перад ім усю прыгажосць жыцця.
І параілі жыццё не ўскладняць,
бо адчай і смутак у маладыя гады –
калі не вар'яцтва, то глупства.
А пасля,
напхаўшы кішэні яму смехам і аптымізмам,
зноў адправілі ў свет:
складаць новыя песні з новымі пачуццямі і матывамі…
Але прайшоў час, і ён вярнуўся:
з вясёлай усмешкай на сумным твары,
з безупынным адчаем у бадзёрых вершах,
штучных і ненатуральных,
са слязамі на радасных вачах.
І толькі ўбачыўшы яго такога,
зразумелі яны,
што не гадамі вымяраюцца смутак і туга
і што ў розных люстрах свет адбіваецца
неаднолькава.

## БАЛАДА ПРА ТРЫЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ БУСЛОЎ

У мяне на стале кніжка. На першай старонцы яе — белы бусел, які лётае высока ў небе, з шырока разгорнутымі крыламі, сярод сонца, рэдкіх хмар і бясконцага блакіту паветра. Зірнеш на яго і падумаеш: які ж ён прыгожы, безразважліва шчаслівы і моцны! Ён, які заўсёды кудысьці ляціць, хоць у той жа час застаецца на месцы, заўсёды ў небе. І кожны раз мне рабілася добра і радасна, бо якое ж гэта шчасце: увесь час кудысьці ляцець сярод роднага неба, сонечных промняў, светлых пачуццяў. І яшчэ я думаў, што людзі, на жаль, не могуць ляцець усё жыццё, што калі-небудзь патрэбна ўсё ж спыняць палёт, апускацца...

О, які ж я тады быў дурны, сляпы і бязлітасны да гэтай птушкі! Нябога бусел! Толькі праз тыдзень заўважыў я, як табе цяжка, як апусціліся твае крылы і згас твой позірк. Чым мне дапамагчы табе? Словамі суцяшэння? Паэмамі? Ці проста ўзяць аловак і намаляваць пад табой глебу? Але ж я не мастак, але ж тыраж кніжкі — трыццаць тысяч. Трыццаць тысяч буслоў, прыкаваных да неба! І ні кроплі літасці... Можа, іх чакаюць недзе дзеці-бусляняты і няўцешныя буслíхі, родныя дрэвы, родныя гнёзды?.. Тысячы няўцешных буслянят, дрэў, гнёздаў! Чым я дапамагу ім?

Мне вельмі дрэнна... Чым бы ні займаўся, перад вачыма маімі — птушка, якая ніяк не можа апусціцца. На каго б я ні глядзеў... Я іду дадому з вечнай надзеяй, што бусел зрабіў немагчымае, што ён — на зямлі. Надзея так і застаецца надзеяй: неба не адпускае... Я прачынаюся ўначы, запальваю святло і, як дзіця, разгортваю кпіжку. А вынік той жа: бусел ляціць нават тады, калі я сплю! Жорсткія людзі! Ці можна ж так мучыць птушку дзеля нейкай там прыгажосці?! Адпусціце бусла! Вы ж шчаслівыя, як сапраўдныя птушкі, якіх яшчэ не паспелі намаляваць! Вы можаце лётаць колькі пажадаеце і, па жаданню,— апускацца ў родныя гнёзды, да каханай... Але вы не заўважаеце свайго шчасця і крычыце толькі адно: калі вы на зямлі,— што вам не даюць лётаць; калі вы ў небе,— што вам перашкаджаюць апускацца.

Мне вельмі дрэнна... з кім бы ні размаўляў... белая слабая птушка... чакаюць дарэмна... чым мне дапамагчы табе?! Ці можна так мучыць бусла? Неба не адпускае ў родныя гнёзды... я прачынаюся ўначы... бо калі сплю... трыццаць тысяч буслоў, прыкаваных да неба... яны ўвесь час крычаць — нема і страшна...

Як апусціліся нашы крылы!..